Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»
Исторический факультет

# БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННОСТЬ: ИСТОКИ, СТАНОВЛЕНИЕ, РАЗВИТИЕ (IX–XXI вв.)

Материалы
Республиканской научно-теоретической конференции

Минск, 29 июня 2017 г.

Минск
РИВШ
2017

УДК 323(476)(091)(082)
ББК 66.3(4Беи)я43
Б43

Р е к о м е н д о в а н о

советом исторического факультета
УО «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка»
(протокол № 10 от 24 мая 2017 г.)

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я :
кандидат исторических наук доцент *А. В. Касович* (отв. ред.);
кандидат исторических наук доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук доцент *А. А. Корзюк;*
кандидат исторических наук доцент *А. Ф. Великий*

Р е ц е н з е н т ы :
доктор исторических наук профессор *А. М. Лютый;*
доктор исторических наук профессор *И. В. Варивончик*

Б43 **Белорусская** государственность: истоки, становление, развитие (IX–XXI вв.) : материалы Респ. науч.-теорет. конф., Минск, 29 июня 2017 г. / редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2017. – 232 с.
ISBN 978-985-586-041-0.

В сборнике представлены актуальные материалы исследований, посвященные проблемам белорусской государственности в историческом, социально-культурном и геополитическом аспектах.
Адресуется преподавателям, аспирантам и студентам вузов.

**УДК 323(476)(091)(082)**
**ББК 66.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-586-041-0**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2017

10. Советская военная администрации в Германии, 1945–1949. Справочник / отв. ред.: Я. Фойтцик, Т. В. Царевская-Дякина, А. В. Доронин; при участии: Х. Кюнцель, Д. Н. Нохотович. – М.: РОССПЭН, 2009. – 1031 с.

11. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны, 1941 – 1945 гг.: Сборник документов / М-во иностр. дел СССР.: в 6 т. / редкол.: А.А. Громыко (гл. ред.) [и др.]. – М.: Политиздат, 1978–1984. – Т. 4. Крымская конференция руководителей трех союзных держав – СССР, США и Великобритании (4 – 11 февр. 1945 г.). – 1984 г. – 302 с.

12. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны, 1941 – 1945 гг.: Сборник документов / М-во иностр. дел СССР.: в 6 т. / редкол.: А.А. Громыко (гл. ред.) [и др.]. – М.: Политиздат, 1978–1984. – Т. 6. Берлинская (Потсдамская) конференция руководителей трех союзных держав – СССР, США и Великобритании (17 июля – 2 авг. 1945 г.). – 1984 г. – 511 с.

13. Снапкоўскі, У.Е. Рэпарацыі / У.Е. Снапкоўскі // Энцыкл. гіст. Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993 – 2003. – Т. 6. Кн. 1 / Г.П. Пашкоў [і інш.]. – 2005. – 592 с. – С. 172–173.

## ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

***Альховік М.К., лячэбны факультэт, БДМУ, Мінск***
***навук. кір. – Зялінскі П.І., доктар гістарычных навук, прафесар***

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. савецкая ўлада абвясціла аб праве нацый на самавызначэнне ажно да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў. Пад нацыяй разумелася агульнасць людзей, якая гістарычна склалася і валодала агульнасцю мовы, тэрыторыі, эканамічнага жыцця, псіхічнага складу, культуры [17, с. 6-8]. Беларусы ўспрымаліся як асноўная, тытульная нацыя БССР, таму з першай паловы 1920-х гг. магістральным напрамкам нацыянальнай палітыкі ў БССР з'яўлялася беларусізацыя, накіраваная на пераадоленне наступстваў русіфікацыі, забеспячэнне дамінуючага становішча беларускага пралетарыяту, беларускай мовы і беларускай сацыялістычнай культуры ў БССР і трансфармацыю беларускай "буржуазнай" нацыі ў "сацыялістычную". У рамках беларусізацыі праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на перавод дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў на беларускую мову для абслугоўвання на ёй тытульнага насельніцтва, вылучэнне працоўных беларусаў на адказныя і кіраўнічыя пасады, выхаванне нацыянальнай самасвядомасці і забеспячэнне колькаснай перавагі беларусаў у складзе пралетарыяту і інтэлігенцыі, папулярызацыю беларускай мовы і культуры сярод нацыянальных меншасцяў БССР, вывучэнне гісторыі, геаграфіі, эканомікі Беларусі, традыцый і побыту насельніцтва, беларускай мовы і культуры, будаўніцтва сацыялістычнай культуры замест «буржуазнай надкласавай» [4, с. 27]. Палітыка беларусізацыі разглядалася ў якасці неабходнай умовы ажыццяўлення дыктатуры пралетарыяту, эканамічнага і культурнага ўздыму БССР, умацавання дзяржаўнай граніцы, узмацнення прасавецкіх сімпатый за мяжой і недапушчэння выхаду БССР са складу СССР [9, арк. 23-24].

Іншыя ўяўленні аб беларусізацыі мела частка партыйна-савецкіх дзеячаў і прадстаўнікоў беспартыйнай інтэлігенцыі, якія лічылі нацыянальнае пытанне самадастатковым, разглядалі БССР як правобраз нацыянальнай дзяржавы, а беларусізацыю як маштабны праект і важны этап нацыянальнага адраджэння, сродак узмацнення нацыянальнай свядомасці, палітычнай актыўнасці і самаарганізацыі беларусаў. Ідэйна-палітычныя ўяўленні гэтага асяроддзя грунтаваліся на неабходнасці гаспадарчай і палітычнай аўтаноміі і культурнага адасаблення БССР, паскарэння тэмпаў беларусізацыі і нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў этнаграфічных межах рассялення беларусаў, папулярызацыі беларускай нацыянальнай ідэі, традыцый і гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Кіраўніцтва БССР асцерагаліся з'яўлення палітычнай стратэгіі, накіраванай на канстытуіраванне альтэрнатыўных савецкай уладзе палітычных эліт, надкласавай палітычнай нацыі і мадэрнізацыі БССР па капіталістычным шляху [2, с. 28, 32; 18, с. 35]. Адначасова ў БССР існавала сацыяльная група прыхільнікаў асіміляцыі нярускага

насельніцтва і праціўнікаў стварэння дзяржаўных інстытутаў і адзінак па нацыянальнай прыкмеце. Яе прадстаўнікі выступалі пад лозунгамі пралетарскага інтэрнацыяналізму, «адзінай савецкай рэспублікі» ці «адзінай і непадзельнай Расіі», адмаўлялі існаванне беларускай савецкай дзяржаўнасці, беларускага пралетарыяту і беларусаў як нацыі, неабходнасць падтрымкі беларускай мовы і культуры і інш. [16, с. 23].

Адной з галоўных прыкмет нацыі з'яўляецца мова. У адпаведнасці з ідэалогіяй марксізму і афіцыйнымі дакументамі роднай мовай лічылася найбольш зразумелая і даступная чалавеку размоўная мова, якую ён ужывае у побыце, у размовах з бліжэйшым акружэннем. Падмена роднай мовы мовай нацыянальнасці альбо мовай продкаў лічылася ўхілам ад "ленінскай нацыянальнай палітыкі". Да снежня 1933 г. у мэтах пераадолення наступстваў русіфікацыі вялікая частка дзяржаўных работнікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі атаясамляла родную мову чалавека з мовай яго нацыянальнасці [14, с. 124, 204, 238].

Узмацненне прэстыжнасці і павелічэнне сацыяльных функцый беларускай мовы было немагчыма без прыстасавання дзяржаўнага апарату да яе выкарыстання. У сувязі з колькаснай перавагай беларусаў пераважнай для зносін дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый была выбрана беларуская мова. Дзяржаўным служачым, членам КП(б)Б, ЛКСМБ, кааператываў і г.д. прапаноўвалася карыстацца беларускай мовай у справаводстве, падчас публічных мерапрыемстваў, у размовах паміж сабой і з насельніцтвам, ведаць беларускую літаратуру, культуру, гісторыю і эканоміку БССР, гісторыю КП(б)Б і ЛКСМБ, улічваць умовы БССР, традыцыі і побыт беларусаў, разумець сутнасць нацыянальнай палітыкі, рэагаваць на нацыянальныя канфлікты, выступленні супраць БССР, беларускай мовы і культуры і г.д. Пераводу на беларускую мову падлягалі практычна ўсе дзяржаўныя інстытуты і грамадскія арганізацыі, у т.л. транспарт, ваенкаматы, вайсковыя шпіталі, беларускія аддзяленні выдавецтваў, банкаў і навучальных устаноў РСФСР, не выключаючы работнікаў з іншых рэспублік СССР. Так, у Натарыяльнай інструкцыі Народнага камісарыята юстыцыі БССР 1932 г. беларуская мова вызначалася адзінай мовай справаводства натарыяльных кантор і народных судоў (акрамя нацыянальных). На беларускай мове выпускаліся дакументы масавага характару, бланкі, абвесткі, штампы, пячаткі, вывешваліся шыльды і надпісы [15, с. 4; 1, арк. 68].

У 1929 – пачатку 1930-х гг. беларусізацыя ахапіла дакументазварот, рэгістратуру, выпіску і выданне газет, чытанне дакладаў і справаздач, афармленне шыльдаў і г.д. Падчас спрэчак на сходах і пасяджэннях, у прыватных гутарках і рабоце з наведвальнікамі большасць работнікаў пераходзіла на рускую мову. Так, у Слуцкім раёне дакументацыя вялася на беларускай мове, але толькі чвэрць супрацоўнікаў ужывала яе ў вуснай форме [13, арк. 70]. У 1930 г. у мэтах павышэння эфектыўнасці нацыянальнай работы былі створаны гарадскія і раённыя нацыянальныя камісіі, аднак паслядоўная і сістэмная работа камісій, органаў улады і кіравання ў галіне беларусізацыі адсутнічала. Замест выпрацоўкі комплекснай праграмы нацыянальнага будаўніцтва і сістэматычнага кантролю за яе ажыццяўленнем улады БССР зрабілі стаўку на эпізадычныя масавыя палітыка-ідэалагічныя і культурныя кампаніі і мерапрыемствы (месячнікі, тыднёвікі беларусізацыі, сацыялістычныя спаборніцтвы і ўдарніцтвы па ўжыванні беларускай мовы, рабоце з беларускай кнігай, палітбаі і палітдні па нацыянальным пытанні, месячнікі друку і г.д.) Нацыянальныя камісіі сутыкнуліся з фактамі ігнаравання, фармальнага стаўлення да нацыянальнай палітыкі, адсутнасцю фінансавання і г.д [12, арк. 13-15]. Доля беларускіх школ дасягнула 90%, у 1932 г. на беларускай мове выдавалася 27 з 30 часопісаў, у 1933 г. – 259 з 293 газет, кніжная прадукцыя на беларускай мове склала каля 90%. У якасці вучэбнага прадмета беларуская мова выкладалася незалежна ад паходжання навучэнцаў. Беларусізацыя вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, палітыка-асветных і культурна-асветных устаноў не была завершана [6, арк. 86].

Прадстаўнікі тытульнай нацыі атрымалі права на палітычнае дамінаванне, павялічваўся лік беларусаў у органах улады і кіравання, у асяроддзі інтэлігенцыі, у прадстаўніцтвах устаноў і арганізацый РСФСР у БССР. У канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. колькасць беларусаў на адказных і кіраўнічых пасадах практычна не змянілася, паколькі галоўная ўвага надавалася "ідэалагічнай вытрыманасці" і сацыяльнаму паходжанню

работнікаў [7, арк. 13]. У мэтах укаранення беларускай мовы ў паўсядзённае жыццё індустрыйных цэнтраў і ўцягнення рабочых у будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры адбывалася навучанне і папулярызацыя «беларускай мовы, быту, культуры» сярод гараджан. Пры гэтым улады ўказвалі на неабходнасць дыферэнцыяванага падыходу да рабочых з пункту гледжання нацыянальнасці, ведаў і гатоўнасці ўжываць беларускую мову, патрабавалі, каб яе вывучэнне і ўжыванне з'яўлялася свядомым і добраахвотным актам [2, с. 97-99]. Да 1932 г. справаводства і культурна-масавая работа на прадпрыемствах былі ў асноўным пераведзены на беларускую мову. Руская мова дамінавала ў штодзённых зносінах прафесійных работнікаў, падчас нарад і паседжанняў [3, арк. 50; 5, арк. 54]. Павелічэнне ліку беларусаў у складзе гараджан было абумоўлена не толькі масавай міграцыяй сельскіх жыхароў, але і пераменамі ў нацыянальным самавызначэнні асобных пралетарыяў, якія ў 1926-1927 гг. запісваліся рускімі [10, арк. 189-190; 11, арк. 45].

Савецкая ўлада прытрымлівалася курсу на забеспячэнне дамінуючага становішча беларускай савецкай культуры ў БССР, аб чым сведчыла стварэнне беларускага аддзялення Цэнтральнага кіраўніцтва Дзяржаўнага аб'яднання музычных, эстрадных і цыркавых прадпрыемстваў (1930 г.), рэарганізацыя Тэатра рускай музычнай камедыі ў Тэатр музычнай камедыі БССР (1932), адкрыццё Беларускай студыі пры Цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе (1933), прыкметны рост тыражоў беларускіх кніг і перыядычных выданняў, фонду кінакарцін на беларускай мове ў распараджэнні Белдзяржкіно і да т.п. [8, арк. 111].

Такім чынам, пасля стварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове магістральным напрамкам нацыянальнай работы ў БССР з'яўлялася беларусізацыя, накіраваная на забеспячэнне дамінуючага становішча беларускай мовы, беларускай савецкай культуры і беларускага пралетарыяту ў БССР.

**Літаратура**


Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Фонд 126. – Воп. 1. – Спр. 8.

1. Гаруновіч, А. Супроць нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў розных колераў / А. Гаруновіч. – Менск : Белдзяржвыд, 1930. – 101 с.
2. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці. – Фонд 5. – Воп. 1а. – Спр. 313.
3. Майзель, Л. Десять лет борьбы и строительства / Майзель Л., Ю. Шаповалов. – М. : Центриздат. – Харьков. – Минск : 1930. – 45 с.
4. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 5013.
5. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 5475.
6. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 5606.
7. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 6099.
8. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 6343.
9. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7747.
10. НАРБ. – Фонд 265. – Воп. 1. – Спр. 2944.
11. НАРБ. – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 100.
12. НАРБ. – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 103.
13. Национальное образование в России: концепции, взгляды, мнения, 1905 – 1938 гг. : Сб. док. : в 2-х ч. – М. : ИНПО, 2002. – Ч. 2. – 312 с.
14. Пастанова Народнага камісарыяту Юстыцыі БССР. Натарыяльная інструкцыя // Бюлетэнь Народных Камісарыятаў і Цэнтральных устаноў Беларускай ССР. – 1932. – № 5. – С. 4.
15. Рэзалюцыі Кастрычніцкага Пленуму ЦК КП(б)Б. – Менск : Белдзяржвыд, 1930. – 33 с.
16. Сталін, І. Марксізм і нацыянальнае пытанне / І. Сталін. – Менск : ДВБ, 1934. – 72 с.

17. Чарнушэвіч, А. Беларускі контррэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм / А. Чарнушэвіч. – Менск : БДВ, 1931. – 47 с.

## МОЛАДЗЬ У ОРГАНАХ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921 – 1939 ГГ.)

***Даніловіч В.В., кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск***

Паспяховае вырашэнне пытанняў дзяржаўнага будаўніцтва ў Савецкай Беларусі залежала ад цэлага шэрагу ўмоў і фактараў. Адным з найважнейшых з іх з'яўлялася забеспячэнне падтрымкі савецкай улады рознымі пластамі насельніцтва, асабліва моладдзю. Гаворачы аб прадстаўніцтве маладога пакалення ў органах улады і кіравання Савецкай Беларусі, перш за ўсё, неабходна звярнуць увагу на камсамол, які, як вядома, быў створаны ў якасці апоры і сродка распаўсюджвання ўплыву новай бальшавіцкай улады ў моладзевым асяроддзі.

Гэтай арганізацыі адводзілася важная роля ў палітычнай сістэме краіны. Менавіта камсамол павінен быў ісці ў авангардзе прадстаўніцтва моладзі ў органах улады і кіравання. Яму аказвалася вялікая падтрымка на дзяржаўным узроўні.

Ужо з мая 1921 г. КСМБ накіроўваў у дзяржаўныя ўстановы ССРБ камсамольцаў-практыкантаў, якія пад кіраўніцтвам вопытных работнікаў не менш за 6 месяцаў удзельнічалі ў працы ўстановы, рыхтуючыся да самастойнай дзейнасці па праграме, разлічанай на замяшчэнне той ці іншай пасады. Яны давалі справаздачу аб сваёй працы на камсамольскіх ячэйках, а таксама на моладзевых канферэнцыях [2, с. 39].

Акрамя таго IV Усебеларускі з'езд Саветаў 14 – 18 снежня 1922 г. прыняў рэзалюцыю з заклікам аб аказанні дапамогі камсамолу рэспублікі. Прадстаўнікі КСМБ былі абраныя ў ЦВК ССРБ і на X Усерасійскі з'езд Саветаў, уведзеныя ў калегію наркамата асветы рэспублікі з правам рашаючага голасу. Прычым гэты наркамат павінен быў узгадняць з саюзам лінію паводзін у дачыненні да іншых арганізацый моладзі [4, л. 113]. ЦК камсамола ССРБ меў прадстаўнікоў ва Упраўленні ўпаўнаважанага Рэўваенсавета рэспублікі – вышэйшага калегіяльнага органа кіравання Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміяй, а таксама пры цэнтральным ваенным камісарыяце ССРБ, у Белдзяржвыдавецтве [5, л. 1; 6, л. 90, 133].

У сакавіку 1924 г. у ЦВК БССР камсамольцам было выдзелена 4 месцы (2 з рашаючым голасам і 2 кандыдацкіх (для камсамольца-рабочага і камсамольца-селяніна), а таксама 1 месца ў Прэзідыуме з'езда Саветаў БССР (туды і ў ЦВК быў абраны першы сакратар КСМБ М. Арэхва) [5, л. 26].

У той жа час выразна прасочваецца тэндэнцыя да павелічэння прадстаўніцтва моладзі ў органах улады і кіравання, асабліва ў Саветах.

Разам з тым, у пачатку 1920-х гг. адсутнічала зладжаная сістэмная камсамольская работа ў Саветах і іншых органах дзяржаўнага кіравання. Толькі з 1924 г. гэта праца актывізавалася у выніку чаго назіраўся рост колькасці камсамольцаў у Саветах, выканкамах і інш. дзяржаўных органах [2, с. 39 – 42]. Адначасова кіраўніцтва ЛКСМБ імкнулася да таго, каб праца камсамольцаў у гэтых структурах ажыццяўлялася ў цесным узаемадзеянні з кампартыяй. Па рашэнні ЦК саюза камсамольскія фракцыі ў Саветах не ствараліся, а камсамольцы ўваходзілі ў фракцыі камуністаў [19, с. 136].

Наогул рост колькасці камсамольцаў у Саветах быў нестабільны. Ужо ў 1925 г. у выніку перавыбараў іх працэнт у Саветах знізіўся, бо часта камсамольскія ячэйкі выступалі неарганізавана і самі камсамольцы не мелі яшчэ трывалага аўтарытэту сярод насельніцтва.

З 1927 г. не толькі ЛКСМБ, але і моладзь, якая не ўваходзіла ў яго склад, сталі ўдзельнічаць у перавыбарах больш актыўна, чым раней, што можна растлумачыць паляпшэннем агульнага сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне. Камсамол БССР павялічыў сваё прадстаўніцтва ў Саветах рэспублікі. Разам з тым, у Саветах была прадстаўлена і значная колькасць інш. юнацтва. Аднак сістэмная арганізацыя працы камсамольцаў і моладзі ў Саветах па-ранейшаму адсутнічала.

**ОГЛАВЛЕНИЕ**

*Секция 1. Белорусская государственность в IX – XIII вв.* ........................................................3
Риер Я.А. ПРОЦЕСС ИНСТИТУЦИОНАЛИЗАЦИИ ВЛАСТИ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ В XI – XIII ВВ. ........................................................3
Темушев С.Н. О ПРИЧИНАХ ПОЛИТИЧЕСКОЙ ОБОСОБЛЕННОСТИ ПОЛОЦКОЙ ЗЕМЛИ ........................................................5

*Секция 2. Государственность на белорусских землях в составе Великого Княжества Литовского и Речи Посполитой* ........................................................9
Голубеў В.Ф. ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ........................................................9
Калечиц И.Л. ГРАФФИТИ ПОЛОЦКОЙ СПАСО-ПРЕОБРАЖЕНСКОЙ ЦЕРКВИ КАК ОТРАЖЕНИЕ ИСТОРИЧЕСКИХ ПРОЦЕССОВ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ ..............12
Люты А.М., Касовіч А.В. ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ЛЕТАПІСАХ XV – XVI СТСТ. ......................14
Мікалаева Л.В. КНІГА МЕТРЫКІ ВКЛ № 560 ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ЛІТВІНСКА-ЛІВОНСКІХ АДНОСІН У КАНЦЫ XV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ. ..............................18

*Секция 3. Институты государственной власти и управления на белорусских землях в составе Российской империи*........................................................21
Анисимова М.Ю. ИНСТИТУТ ЗЕМСТВА НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ В СОСТАВЕ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ ........................................................21
Багдановіч І.І., Багдановіч А.І. СКЛАДВАННЕ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ ПЕРАДУМОЎ УЗНІКНЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў XIX – ПАЧ. XX СТ. ...........................22
Белазаровіч В.А. БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ У ГІСТАРЫЧНАЙ КАНЦЭПЦЫІ В. Ю. ЛАСТОЎСКАГА ........................................................25
Бресская Ю.С., Конойко А.В. СТАНОВЛЕНИЕ ОРГАНОВ ПОЛИТИЧЕСКОЙ ПОЛИЦИИ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1880–1914 ГГ. ........................................................27
Гагохія Н.К., Коцел Г.А. ДВАРАНСКА-ПАМЕШЧЫЦКАЯ АВЕЧКАГАДОЎЛЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ. ........................29
Гец В.И. МУЖСКИЕ ГИМНАЗИИ МОГИЛЕВСКОЙ ГУБЕРНИИ (1793-1917гг.)..............32
Гушчынскі І.Г. ЭКСДЫВІЗАРСКІЯ СУДЫ Ў СІСТЭМЕ ПРАВАСУДДЗЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XIX СТ. ........................................35
Дичковская Л.Э. ОТРАСЛИ ФАБРИЧНО-ЗАВОДСКОЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ В БЕЛАРУСИ В 1861-1900 ГГ. ........................................................38
Иванюк Н.С. ПРОБЛЕМЫ АВТОНОМИИ БЕЛОРУССКО-ЛИТОВСКИХ ГУБЕРНИЙ В ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПОЛЬСКИХ ПОЛИТИЧЕСКИХ ПАРТИЙ И ГРУПП В НАЧ. XX В. ....40
Ковшик Ю.Л. ГОСУДАРСТВЕННАЯ СЛУЖБА ДВОРЯНСТВА БЕЛАРУСИ (1772-1914 ГГ.) В ОЦЕНКАХ ДОРЕВОЛЮЦИОННОЙ ИСТОРИОГРАФИИ ........................................43
Крапивин В.С. ОРГАНЫ ГОСУДАРСТВЕННЫХ ИМУЩЕСТВ В СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОМ РАЗВИТИИ БЕЛАРУСИ (1837–1914 гг.) ..........................................46
Куцко К.Г. ЗАМЕЩЕНИЕ СУДЕБНЫХ ДОЛЖНОСТЕЙ ПО ВЫБОРАМ ОТ ДВОРЯНСТВА БЕЛОРУСКИХ ГУБЕРНИЙ (1785-1825 ГГ.)...............................................49
Лютый А.М., Лобанок А.К. ФОРМИРОВАНИЕ БУРЖУАЗИИ В ГОРОДАХ БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ XVIII – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ XIX в. ........................................................51
Ляпешкін Я.М. ЭВАЛЮЦЫЯ ПОГЛЯДАЎ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ НА ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ У ЧАС РЭВАЛЮЦЫІ 1905–1907 гг. .....55
Мароз Д.І. ДВАРАНСКА-ПАМЕШЧЫЦКАЯ БРОВАРНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1861-1914 ГГ. ........................................................57
Пугач І.В. РОЛЯ ЛЕСААХОЎНЫХ КАМІТЭТАЎ У АХОВЕ ЛЯСОЎ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ. ........................................................59
Рацько А.Ф. ДВАРАНСКА-ПАМЕШЧЫЦКАЯ КОНЕГАДОЎЛЯ Ў БЕЛАРУСІ (1861-1914 ГГ.) ........................................................62

Рацько А.Ф., Сазонава К.У. ГАСПАДАРЧА-ЭКАНАМІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ АДМЕНЫ ПРЫГОНУ .................................... 65
Снигирова Р.Ю. УЧАСТИЕ ДВОРЯНСТВА В ДЕЯТЕЛЬНОСТИ МИНСКОГО ОБЩЕСТВА СЕЛЬСКОГО ХОЗЯЙСТВА ........................................ 68
Трестьян И.Н. КАНЦЕЛЯРИЯ ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТОРА В ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ XIX В.: СТРУКТУРА, ФУНКЦИИ, КАДРЫ ........................................ 70
Трубчык П.А. СУЧАСНАЯ АЙЧЫННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ АФАРМЛЕННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ І РУХАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ. ........................................ 74
Чуль Р.В. ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ГУБЕРНСКИХ КОМИТЕТОВ И ПРИСУТСТВИЙ ПО ОБЕСПЕЧЕНИЮ ПРАВОСЛАВНОГО ДУХОВЕНСТВА (1842–1885) ........................................ 76
Шимукович С.Ф. УНИФИКАЦИЯ В РАМКАХ АДМИНИСТРАТИВНОЙ ПОЛИТИКИ В БЕЛОРУССКОМ РЕГИОНЕ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ В XIX В. ........................................ 79
Янкоўская В.С. СТАН БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ. ........................................ 82

*Секция 4. Белорусская государственность на советской основе* ........................................ 85
Абрамчык К.Б. РЭПАРАЦЫІ З ГЕРМАНІІ Ў БССР У 1945–1948 ГГ. ........................................ 85
Альховік М.К. ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ........................................ 88
Даніловіч В.В. МОЛАДЗЬ У ОРГАНАХ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921 – 1939 ГГ.) ........................................ 91
Забаронак К.І. КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ НА ЧЭРВЕНЬШЧЫНЕ Ў 30-Я ГГ. XX СТ. НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ “КАЛЕКТЫВІСТ” ........................................ 94
Иоффе Э.Г. РОЛЬ АЛЕКСАНДРА МЯСНИКОВА В СТАНОВЛЕНИИ БЕЛОРУССКОЙ СОВЕТСКОЙ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ ........................................ 96
Йоцюс В.А. ВОЗВРАЩЕНИЕ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫХ ПЕРЕСЕЛЕНЦЕВ ИЗ БССР (1920–начало 1940-х гг.) ........................................ 99
Приборович А.А. ОБСТОЯТЕЛЬСТВА СТАНОВЛЕНИЯ ЦЕНТРАЛЬНЫХ ОРГАНОВ СОВЕТСКОЙ СТАТИСТИКИ БЕЛАРУСИ ........................................ 102
Рыбак Л.А. СЁСТРЫ ХАТЫНИ ИЛИ СОЖЖЁННЫЕ ДЕРЕВНИ ДЗЕРЖИНСКОГО РАЙОНА ........................................ 105
Самонаў В.В. СТАН БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў САВЕЦКІ ПЕРЫЯД ........................................ 107
Цыганков С.С. ФОРМИРОВАНИЕ ОРГАНОВ СЛЕДСТВИЯ КАК ЭЛЕМЕНТ БЕЛОРУССКОЙ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ В СОВЕТСКИЙ ПЕРИОД ........................................ 109

*Секция 5. Республика Беларусь – независимое государство* ........................................ 112
Баўдзей В.М. ДЫСЕРТАЦЫІ ПА ГІСТОРЫІ ВАЕННАЙ КАМПАНІІ 1812 Г., АБАРОНЕНЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ ........................................ 112
Волкова Т.И. РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ - НЕЗАВИСИМОЕ ГОСУДАРСТВО ........................................ 114
Гавриков А.В. ПРАВОВОЕ РЕГУЛИРОВАНИЕ СОЗДАНИЯ И ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПОЛИТИЧЕСКИХ ПАРТИЙ БЕЛАРУСИ И ПОЛЬШИ (СОЦИАЛЬНО-ПОЛИТИЧЕСКИЙ АНАЛИЗ) ........................................ 116
Гец В.И. СОСТОЯНИЕ И РАЗВИТИЕ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВА В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ ........................................ 119
Ефимович Е.В., Павлова Н.В. СТАНОВЛЕНИЕ ПРАВОВОГО ГОСУДАРСТВА В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ: ПРОБЛЕМЫ И ПЕРСПЕКТИВЫ ........................................ 122
Жмодикова Е.А. БЕЛОРУССКАЯ ИДЕНТИЧНОСТЬ В ГЛОБАЛЬНОМ МИРЕ ........................................ 124
Кузьміч С.В. УПЛЫЎ ГЕАПАЛІТЫЧНАГА СТАНОВІШЧА НА ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (1991-1994) ........................................ 126
Філазаповіч Т.У. МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА МОЛАДЗІ НА ЭТАПЕ СТАНАЎЛЕННЯ МАЛАДЗЁЖНАЙ ПАЛІТЫКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ........................................ 128

*Секция 6. Проблема белорусской государственности в историографии, источниковедении и учебной литературе* ...... 131
Осипович А.И. ПРОБЛЕМА АНГЛО-БЕЛОРУССКИХ СВЯЗЕЙ И КОНТАКТОВ В МЕЖВОЕННЫЙ ПЕРИОД В БЕЛОРУССКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ ...... 131

*Секция 7. Становление и развитие белорусской государственности в контексте геополитических процессов в мире* ...... 134
Багдановіч І.І., Багдановіч А.І. ДА ПЫТАННЯ АБ ЛЮДСКІХ СТРАТАХ САВЕЦКАГА САЮЗА І ГЕРМАНІІ Ў ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ ...... 134
Ковяко И.И. ПРОБЛЕМА ДАТИРОВКИ ВТОРОГО БЕРЛИНСКОГО КРИЗИСА В АНГЛО-АМЕРИКАНСКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ ...... 137
Корзюк А.А. ПРОЕКТИРОВАНИЕ ПРОЦЕССА ОБУЧЕНИЯ ИСТОРИИ В УЧРЕЖДЕНИЯХ ОБЩЕГО СРЕДНЕГО ОБРАЗОВАНИЯ В УСЛОВИЯХ РЕАЛИЗАЦИИ КОМПЕТЕНТНОСТНОГО ПОДХОДА ...... 139
Корзюк В.А. СЕМЕЙНЫЕ РЕЛИКВИИ. ИСТОРИЯ ОДНОЙ МЕДАЛИ ...... 143
Коровянская С.И. ПИСЬМО САМАНТЫ СМИТ: БОРЬБА АНДРОПОВА ЗА ОБЩЕСТВЕННОЕ МНЕНИЕ США ...... 145
Маруженко Ю.А. ВЛИЯНИЕ ЯЗЫЧЕСКИХ ВЕРОВАНИЙ НА СТАНОВЛЕНИЕ ХРИСТИАНСТВА НА РУСИ В X-XIII ВЕКАХ ...... 147
Попуренко И.Р. НАСЛЕДОВАНИЕ КОРОЛЕВСКОЙ ВЛАСТИ В ИЕРУСАЛИМСКОМ КОРОЛЕВСТВЕ КРЕСТОНОСЦЕВ ...... 150
Приступа Н.Н. ДВИЖЕНИЕ ANO – НОВЫЙ ИГРОК НА ПОЛИТИЧЕСКОЙ СЦЕНЕ ЧЕШСКОЙ РЕСПУБЛИКИ ...... 152
Prohorevich A. THE MORAVIAN SEPARATISM ...... 156
Сурта Е.Н. ЛЕЙПЦИГСКИЕ ПОСТАНОВЛЕНИЯ ОБ ОДЕЖДЕ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XV В. ...... 158
Шупляк П.А. ГЕРМАНСКИЕ ПРОФСОЮЗЫ В ПЕРИОД АКТИВИЗАЦИИ КОНСЕРВАТИВНО-РЕАКЦИОННЫХ СИЛ В СТРАНЕ (ИЮНЬ – НОЯБРЬ 1932 Г.) ...... 160

*Секция городской научно-теоретической конференции «Московский район г. Минска: история и современность (1977-2017 гг.)». К 40-летию Московского района* ...... 164
Азардович С.А. МЕЖДУНАРОДНАЯ МОЛОДЕЖНАЯ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ «ВЕЛИКАЯ ОТЕЧЕСТВЕННАЯ ВОЙНА 1941 – 1945 ГОДОВ В ИСТОРИЧЕСКОЙ ПАМЯТИ НАРОДА» КАК СРЕДСТВО ГРАЖДАНСКО-ПАТРИОТИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ ...... 164
Бондаркова В.А., Сазонова Е.В. ИСТОРИЯ УЛИЦ МОСКОВСКОГО РАЙОНА ...... 166
Буйніцкая А.Ю. ГІСТОРЫЯ МІКРАРАЁНА МАЛІНАЎКА Ў ЯГО НАЗВАХ ...... 168
Василевич М.Г., Сущинская И.Ю. БРИЛЕВИЧИ В ИСТОРИКО-ТОПОНИМИЧЕСКОМ ПРОСТРАНСТВЕ МИНСКА ...... 170
Гайдук Н.Ю. РАЗВИТИЕ ФИЗИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ И СПОРТА В МОСКОВСКОМ РАЙОНЕ Г. МИНСКА ...... 173
Головаш Д.А., Волосач К.В. БОБРУЙСКИЙ СКВЕР ...... 175
Гончарук К.В., Давыдова Н.А. ПАРК ИМЕНИ ПАВЛОВА В МОСКОВСКОМ РАЙОНЕ Г. МИНСКА ...... 177
Гораев Н. МОСКОВСКОЕ РУВД Г. МИНСКА: ИСТОРИЯ И ЛЮДИ ...... 178
Грак К.А. УЛИЦА БЕЛЕЦКОГО ...... 180
Дембицкая Л.Л. РЕАЛИЗАЦИЯ МОЛОДЕЖНОЙ ПОЛИТИКИ В МОСКОВСКОМ РАЙОНЕ Г. МИНСКА ...... 181
Дробыш Д.Д. ИСТОРИЯ ПОЖАРНОЙ СЛУЖБЫ МОСКОВСКОГО РАЙОНА Г. МИНСКА ...... 182
Дудник Л.Т., Дроздова Е.А. УЛИЦА ВОЛОХА МОСКОВСКОГО РАЙОНА ГОРОДА МИНСКА ...... 184
Земляник Н.В. ИСТОРИЯ МОСКОВСКОГО РАЙОННОГО ОТДЕЛА СЛЕДСТВЕННОГО КОМИТЕТА Г. МИНСКА ...... 185

Иоффе Э.Г. ВУЗЫ МОСКОВСКОГО РАЙОНА В 1977-2017 ГОДАХ ................................ 187
Казак Ю.А. ПРАСПЕКТ ЖУКАВА Ў МАСКОЎСКІМ РАЁНЕ Г. МІНСКА ........................ 190
Казаровец А.В. ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭКІ №1 ІМЯ ЛЬВА МІКАЛАЕВІЧА ТАЛСТОГА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ ........................................................................................................... 192
Каминская Л., Буко И.Г. СКВОЗЬ ВЕКА… .......................................................................... 194
Киселёва В.А., Пожога С.К. ПАТРИОТИЧЕСКОЕ ВОСПИТАНИЕ В ШКОЛАХ МОСКОВСКОГО РАЙОНА Г. МИНСКА .............................................................................. 197
Космачёва М.М., Иванов А.А. ИСТОРИЯ МИНСКА В НАЗВАНИЯХ УЛИЦ МОСКОВСКОГО РАЙОНА .................................................................................................... 199
Лапатинский П.В., Коршун Е.А. УЛИЦА КОРЖА В МОСКОВСКОМ РАЙОНЕ Г. МИНСКА ........................................................................................................................ 202
Мамчиц Е. ДИАЛОГ ОБЩЕСТВА И ВЛАСТИ: «ВМЕСТЕ – ЗА СИЛЬНУЮ И ПРОЦВЕТАЮЩУЮ БЕЛАРУСЬ» ........................................................................................ 203
Марозік Д.Дз. СПАДЧЫНА СЛАВУТАГА ЗЕМЛЯКА .......................................................... 205
Невмержицкая Л.К., Саевич А. НАШИ ШЕФЫ .................................................................... 208
Плесканёва А.С. ВУЛІЦА ІМЯ ЯНА ЧАЧОТА МАСКОЎСКАГА РАЁНА Г. МІНСКА .... 210
Рыбак Л.А. МИНСКИЙ МЕТОРОПОЛИТЕН – ВАЖНЕЙШАЯ ТРАНСПОРТНАЯ АРТЕРИЯ МОСКОВСКОГО РАЙОНА МИНСКА ................................................................ 212
Савеня Г.А. ВУЛІЦА ІМЯ БРАТОЎ ТЫШКЕВІЧАЎ У МАСКОЎСКІМ РАЁНЕ Г. МІНСКА ........................................................................................................................................ 214
Саўко М.А. ВУЛІЦА ІМ. СТАСАВА ........................................................................................ 216
Саўчанка А.П., Слівіна В.К. ВУЛІЦА ХМЯЛЕЎСКАГА ....................................................... 217
Сидоренко Е.П. ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ БИБЛИОТЕКИ ИМ. ЛЬВА НИКОЛАЕВИЧА ТОЛСТОГО В 1911 – 1980 ГГ. ..................................................................................................... 219
Симончик А.С., Родькина М.В. МАЛИНОВКА – МИКРОРАЙОН МОСКОВСКОГО РАЙОНА Г. МИНСКА .............................................................................................................. 221
Чарнавок Д.Ю., Федзюк Г.Ю. ПЛОШЧА ФРАНЦІШКА БАГУШЭВІЧА Ў МАСКОЎСКІМ РАЁНЕ Г. МІНСКА ............................................................................................................ 223
Чернухо М.В. УЛИЦА КАРПОВА В МОСКОВСКОМ РАЙОНЕ Г. МИНСКА .................. 224
Шишковская Ю.Ю. УЛИЦА ГУРСКОГО В МОСКОВСКОМ РАЙОНЕ Г. МИНСКА ....... 226

Научное издание

**БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННОСТЬ: ИСТОКИ, СТАНОВЛЕНИЕ, РАЗВИТИЕ (IX–XXI вв.)**

Материалы
Республиканской научно-теоретической конференции
Минск, 29 июня 2017 г.

*В авторской редакции*
Ответственный за выпуск *С. П. Шупляк*

Подписано в печать 28.06.2017. Формат 60×84/16.
Бумага офсетная. Ризография.
Усл. печ. л. 13,9. Уч.- изд. л. 25,8. Тираж 56 экз. Заказ 52.

Издатель и полиграфическое исполнение
государственное учреждение образования
«Республиканский институт высшей школы».
Свидетельство о государственной регистрации издателя,
изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/174 от 12.02.2014.
Ул. Московская, 15, 220007, г. Минск.